Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ПАГОДЫ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае
Кіраўніцтва АГМС БССР

№ 14 (194)	11—20 мая	1935 г.

ЗМЕСТ

АГЛЯД НАДВОР'Я 2-й ДЭКАДЫ МАЯ

На працягу першых 4-х дзён дэкады ў БССР стварылася плынь морскага арктычнага паветра, якое паступала на кантынент праз Скандынавію і Балтыцкае мора. За час кароткага шляху пад сухазем'ем паветра не паспявае дастаткова прагрэцца і таму ў БССР у гэтыя дні наглядаюцца паніжаныя т-ры, па начам месцамі нават замаразкі. Наогул характар надвор'я гэтых дзён няўстойлівы, г. зн. наглядаецца ваганне колькасці воблачнасці і часамі выпадзенне ападкаў.

Ападкі ствараюцца часткова ў выніку вертыкальнай неўстойлівасці паветра (праграванне яго знізу і таму стварэнне вертыкальных рухаў і перанос вільгаці ўверх) і ў выніку прасоўвання франтальных паверхняў. Морскае арктычнае паветра на працягу першай паловы дэкады ахапляе амаль усю еўрапейскую тэрыторыю Саюза.



У выніку застайвання гэтага паветра пад кантынентам яно хутка і значна праграваецца, ператвараючыся такім чынам у кантынентальнае палярнае. З гэтымі новымі ўласцівасцямі яно з сярэдзіны дэкады пачынае прыходзіць у БССР, з пачатку

Табліца вынікаў метэаралагічных назірання ў з 11—20 мая 1935 г.

Назва станцый	Тэмпература паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны чыслы)
	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум		Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	
Дрыса	6	3	4	6	7	12	13	11	16	13	—	9	—	19	—3	12	61	—	—3	13	..	6.0	0.6	..	..	..	..	..	7.0	5.0	—	18.6	тум. (13), бура (16), нав. (10)
Полацк	6	4	5	7	9	10	11	12	16	16	—	10	12	21	0	12	55	—	—	—	..	7.0	0.3	..	..	..	..	..	2.0	..	—	9.3	—
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Нова-Каралёва	4	6	4	5	10	10	10	14	18	15	—	10	12	24	0	12	55	30	—3	15	..	..	..	..	..	..	..	6.0	1.0	13.0	—	20.0	—
Лепель	6	6	5	7	9	11	10	12	16	16	—	10	—	21	1	13	56	—	0	15	0.1	5.0	1.0	..	..	..	0.1	..	5.0	0.1	—	11.3	навальн. (19, 20)
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Барысаў	7	8	6	8	9	12	9	12	17	16	—	10	13	22	0	15	52	—	—3	15	0.1	0.4	0.1	..	..	..	..	..	2.0	0.3	—	2.9	туман (15, 19)
Менск	7	7	6	7	8	11	8	10	15	16	—	10	13	21	0	14	60	—	—	—	0.1	1.0	0.3	..	..	0.1	0.1	0.1	12.0	..	—	13.6	нав. з градам (15), туман (18)
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	0.2	1.0	1.0	..	1.0	..	1.0	..	3.0	..	—	7.2	—
Мар'іна-Горка	7	8	7	7	10	12	9	11	17	17	—	10	13	—	—1	13	56	38	0	13	..	..	0.3	..	..	..	0.1	..	0.1	4.0	—	4.5	—
Асіпавічы	8	9	8	8	11	13	9	12	19	17	—	11	13	25	0	13	54	—	—	—	..	15.0	1.0	..	..	0.1	..	..	0.3	35.0	—	51.4	нав. (12), нав. з градам (20)
Орша	5	8	5	7	10	10	10	14	20	17	—	11	12	24	0	15	59	—	—3	12	1.0	3.0	1.0	..	..	..	..	..	4.0	16.0	—	25.0	нав. (11), лівень (20)
Горкі	6	8	6	8	9	10	10	14	18	18	—	11	12	24	1	12	56	32	0	11	0.1	1.0	1.0	..	..	..	0.1	1.0	1.0	1.0	—	5.2	—
Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	бура (11, 12, 20) нав. (12, 19, 20)
Слуцк	7	10	9	7	10	12	10	12	16	16	—	11	—	22	—1	13	60	—	1	13	0.1	0.3	2.0	..	..	..	..	..	16.0	..	—	18.4	—
Мар.-Сосны	8	11	9	8	10	13	10	12	16	16	—	11	14	23	0	12	56	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	..	нав. (20), туман (18)
Магілеў	5	8	7	9	9	10	9	14	19	16	—	11	13	24	1	13	59	—	—	—	..	..	1.0	..	..	..	..	..	6.0	11.0	—	18.0	—
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	град (11)
Чэрыкаў	6	10	7	10	10	11	8	11	20	19	—	12	13	25	2	13	56	—	—	—	0.5	5.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	5.5	—
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	
Турск	7	9	7	11	11	11	8	14	20	17	—	11	13	24	1	12	56	37	—1	12	1.0	10.0	..	..	..	..	..	..	10.0	0.1	—	21.1	нав. з градам (12) нав. (20)
Жлобін	7	10	8	12	12	12	8	14	19	18	—	11	13	25	0	16	56	—	—	—	0.1	14.0	..	..	..	0.1	..	..	8.0	0.1	—	22.3	нав. (12, 20)
Жыткавічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Калінкавічы	8	10	9	11	12	13	9	13	19	18	—	12	14	25	2	12	58	—	—	—	..	3.0	..	..	..	..	..	..	9.0	11.0	—	23.0	нав. (19, 20)
Лельчыцы	10	12	9	10	12	14	11	13	17	19	—	13	—	25	—	—	60	49	—	—	0.1	0.1	3.0	..	..	..	0.1	..	..	4.0	—	7.3	нав. (20)
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	2.0	1.0	..	..	..	..	..	..	0.1	..	—	3.1	нав. (20)
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Гомель	8	9	8	12	10	11	8	15	20	20	—	12	14	26	3	12	58	—	2	12	..	5.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	5.0	—
Васілевічы	8	9	9	11	11	13	9	13	19	18	—	12	14	24	3	12	59	38	1	12	0.2	2.0	..	..	..	..	..	..	13.0	..	—	15.2	—
Камарыно	10	12	12	12	11	11	9	14	19	19	—	13	14	25	2	12	62	—	—	—	..	4.0	3.0	2.0	1.0	0.1	0.1	0.1	16.0	..	—	26.3	туман (18) нав. (19)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 11 — 20 мая 1935 г.

Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя у %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхавага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
Дрыса	NW	4	SW	20	—	8	5	вільготная
Полацк	SE	4	SE	6	—	8	5	вільготная
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
Нова-Каралёва	SE	4	E	12	—	8	5	мокрая
Лепель	NE	4	SE	12	—	8	5	вільготная
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
Барысаў	SE	4	SE	6	—	8	5	—
Менск	SE	4	S	12	—	8	5	—
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
Мар'іна-Горка	E	4	S	6	41	8	—	вільготная
Асіпавічы	SE	4	SE	9	—	8	5	вільготная
Орша	SE	6	SE	14	—	9	5	вільготная
Горкі	SE	4	NW	6	50	8	5	вільготная
Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
Слуцк	SE	4	N	20	—	8	5	вільготная
Мар'іна-Сосны	SE	4	NW	7	—	5	5	—
Магілеў	SE	4	SE	7	—	8	5	мокрая
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
Чэрыкаў	SE	4	W	7	—	9	3	вільготная
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
Турск	SE	6	SE	17	—	8	5	вільготная
Жлобін	SE	4	NW	6	—	8	5	вільготная
Жыткавічы	—	—	—	—	—	—	—	—
Калінкавічы	SE	4	NW	6	—	8	5	вільготная
Лельчыцы	SE	4	SE	4	—	8	5	вільготная
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
Гомель	SE	4	E	9	—	8	6	вільготная
Васілевічы	SE	4	SE	7	34	8	5	—
Камарыно	SE	4	SE	9	—	8	5	вільготная

ад усхода, а затым з паўднёвага ўсхода. На некаторы час (15-га і 16-га) у БССР устанаўліваецца зусім яснае надвор'е.

Але к гэтаму часу з захада праз Заходнюю Еўропу пачынаюць падыходзіць масы морскага палярнага паветра, якое за час праходжання пад сухазем'ем хоць і паспела прагрэцца, але была менш цёплым у параўнанні з кантынентальна палярным (у апошнім к канцу дэкады дзённыя тэмпературы даходзілі да 25, 26°). Франтальная паверхня, паміж паказанымі паветранымі масамі ў прадапошні дзень дасягае заходніх частак БССР і павольна рухаецца далей к усходу, ствараючы воблачны пакроў.

У сувязі з гэтым у заходніх частках праходзяць дажджы, месцамі ў вялікай колькасці (Менск 19-га), якія распаўсюджваюцца к усходу.

У апошні дзень дэкады заходнюю палову БССР да Дняпра займала марское палярнае паветра, у той час як усходняя частка заставалася занятай кантынентальным паветрам. Гэта адбілася ў некаторым кантрасце тэмпературнага рэжыму абодвых частак краіны 20 мая, а таксама і ў адносінах напрамку ветра.

Садоўскі

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЗА 11—20 мая 1935 года

Спачатку гэтай дэкады тэмпература паветра трымалася вельмі нізка. Сярэдняя сутачная т-ра вагалася ад 3°-4° да 10°—12°.

У наступныя дні наглядалася паступовае падвышэнне т-ры і к канцу дэкады сярэднія сутачныя дасягнулі 16°—20°. Сярэдняя дэкадная т-ра вагалася ад 9° да 13°, у параўнанні з нармальнай т-рай ніжэй на 1°-2°.

Максімальная т-ра ў большасці дасягала 25°, мінімальная—месцамі была ніжэй 0°, а месцамі некалькі вышэй; такім чынам больш паловы станцый адзначылі прымаразкі пераважна 12-га і 13-га.

Ападкі ў гэтай дэкадзе ў большасці былі навальнічага, ліўнявога характару. Дзякуючы гэтаму і размеркаванне іх было надзвычайна нераўнамернае. Малыя колькасці ападкаў да 5 мм выпалі на паўднёвым усходзе БССР, абмежаваным лініяй Горкі—Гомель. Уздоўж усёй заходняй мяжы БССР, пачынаючы ад Полацка і да Лельчыц ападкаў выпала таксама мала—менш 10 мм. Мар. Сосны адзначыла поўную адсутнасць ападкаў. У астатніх раёнах БССР, пераважна ў цэнтральнай частцы, ападкаў выпала ў большасці 20—25 мм., толькі адна ст. Осіповічы дала 51 мм. ападкаў. На працягу дэкады ападкі размеркаваліся наступным чынам: месцамі значныя ліўнявыя ападкі наглядаліся 12-га, потым на працягу 6 дзён было сухое надвор'е. 19-га значныя ападкі паглядаліся пераважна на поўдні, 20-га—у цэнтральных раёнах. У Менску, Асіпавічах і Турску (Рагачоўскага р-на) адзначана выпадзенне града.

Табліца вынікаў метэаралагічных назіранняў за сакавік 1935 г.

Назва станцый	Тэмпература паветра						Адносная вільг. у %%		Тэмпература на паверхні глебы			Ападкі ў м/м									Вецер		Воблачн. у 10-балавай сістэме		%%	Лік дзён					
														Лік дзён з ападкамі																	
	Сярэдняя	Адхіленне ад нормы	Максімал.	Дата	Мінімальная	Дата	Сярэдняя	Мінімальная	Мінімальная	Дата	Лік дзён з тэмпер. глебы ≤0°	Сума	Норма	≥0.1 мм	≥0.5 мм	≥1.0 мм	≥2.0 мм	≥5.0 мм	≥10.0 мм	≥20.0 мм	Пераважаючы напрамак	Сярэдняя хуткасць	Агульная	Ніжняя	Інсаляцыя ў %% магчымай	Ясных	Пахмурных	З туманам	Са снегавым насцілам		
Полацк	–1.4	+0.6	11.3	23	–13.5	8	75	35	—	—	—	38	25	13	9	8	7	3	1	0	SW	3.8	6.3	4.4	—	3	11	2	16	—	—
Дрыса	–1.5	—	11.1	23	–14.6	9	75	45	–20.6	9	30	34	—	13	10	8	6	3	0	0	W	4.8	5.7	4.2	—	6	11	1	12	—	—
Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	14	—	9	7	5	4	0	0	0	—	—	—	—	—	—	—	4	31	—	—
Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	19	—	9	7	7	5	1	0	0	—	—	—	—	—	—	—	0	27	—	—
Нова-Каралёва	–3.2	0.0	5.5	24	–16.0	8	80	42	–21.3	8	30	16	30	11	8	6	3	0	0	0	S,W	5.4	6.9	5.7	—	4	17	4	31	—	—
Лепель	–2.1	—	9.0	23	–14.1	8	75	42	–18.6	8	31	19	29	13	7	5	3	2	0	0	SW	4.5	6.5	4.2	—	3	12	2	9	—	—
Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	25	—	10	10	9	5	1	0	0	—	—	—	—	—	—	—	1	—	—	—
Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	28	—	11	9	9	4	3	0	0	—	—	—	—	—	—	—	0	—	—	—
Барысаў	–1.9	–0.2	9.0	24	–18.7	9	80	39	–16.0	9	31	30	33	13	12	9	4	3	0	0	NW	3.3	6.9	4.2	—	4	14	4	25	—	—
Менск	–3.1	–1.3	6.4	24	–18.5	9	80	40	—	—	—	17	36	13	9	6	4	0	0	0	SW	5.8	6.6	3.7	—	4	14	7	31	—	—
Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	14	—	7	7	6	3	0	0	0	—	—	—	—	—	—	—	0	31	—	—
Мар'іна-Горка	–2.7	–1.3	7.8	23	–20.1	9	80	48	–18.6	9	30	14	30	12	8	6	2	0	0	0	NW	5.7	7.1	4.3	—	4	16	2	26	—	—
Асіпавічы	–1.7	–0.4	11.0	24	—	—	75	38	—	—	—	26	—	14	9	6	5	2	0	0	NE,S,W	3.9	6.9	4.3	—	3	15	1	25	—	—
Орша	–2.7	–0.2	7.5	24	–17.2	9	80	45	–18.5	8	31	22	34	12	10	7	4	0	0	0	NW	3.9	6.9	5.5	—	5	14	1	23	—	—
Горкі	–3.4	–0.4	7.3	24	–16.4	9	80	48	–21.4	9	31	15	31	11	10	7	4	0	0	0	NW	5.1	7.1	5.2	—	4	13	2	31	—	—
Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	25	—	—
Слуцк	–2.3	—	8.8	24	–20.8	9	80	49	–21.5	9	31	13	32	13	7	5	3	0	0	0	NW	5.4	6.8	4.4	—	2	15	7	20	—	—
Мар.-Сосны	–2.0	–1.3	11.3	23	–22.6	9	75	33	—	—	—	14	—	7	5	5	4	0	0	0	W	3.5	6.0	4.6	—	5	11	6	13	—	—
Магілеў	–2.8	–0.7	9.3	24	–17.5	9	75	47	—	—	—	28	34	13	11	8	7	1	0	0	N, NW	3.7	7.2	4.8	—	3	17	4	29	—	—
Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	31	—	—
Чэрыкаў	–3.1	–0.8	7.9	24	–17.7	9	80	37	—	—	—	28	31	14	10	9	8	1	0	0	S	5.4	6.8	6.3	—	4	12	1	—	—	—
Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	28	—	—
Турск	–2.8	–1.3	6.8	27	–21.3	9	80	36	–24.2	9	30	20	—	11	9	7	6	0	0	0	S	6.1	7.3	5.5	—	2	14	2	—	—	—
Жлобін	–2.2	–0.8	8.8	24	–18.4	9	75	41	—	—	—	25	—	12	9	8	6	0	0	0	NW	4.6	6.7	4.6	—	4	13	3	21	—	—
Жыткавічы	–1.3	–0.8	12.0	24	–20.0	9	75	36	—	—	—	23	26	11	7	6	5	1	0	0	NW	2.9	6.9	4.8	—	4	15	1	16	—	—
Калінкавічы	–1.8	–1.2	10.8	24	–21.2	7	80	36	—	—	—	18	26	10	8	6	4	1	0	0	NW	3.5	5.6	3.1	—	7	11	5	19	—	—
Лельчыцы	–1.3	—	10.7	24	—	—	80	40	—	—	—	14	—	10	6	4	3	0	0	0	N	3.5	6.2	—	—	6	10	—	—	—	—
Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	29	—	11	9	6	6	2	0	0	—	—	—	—	—	—	—	3	26	—	—
Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	39	—	11	11	8	8	3	0	0	—	—	—	—	—	—	—	3	22	—	—
Гомель	–2.0	–0.3	9.1	27	–18.5	9	80	43	–23.3	9	31	21	26	13	7	6	3	2	0	0	S	3.8	6.5	3.6	—	7	16	1	13	—	—
Васілевічы	–2.0	–1.1	9.0	23	–24.8	7	75	44	–26.7	9	28	21	30	15	9	7	2	2	0	0	S	3.5	6.4	5.1	—	5	14	3	23	—	—
Камарыно	–2.0	–1.5	11.4	27	–20.4	9	80	54	—	—	—	18	—	9	8	7	2	1	0	0	S	4.1	6.4	4.5	—	5	14	4	23	—	—

Вятры пераважалі паўднёва-усходнія, мясцамі вельмі сільныя да 20 м/сек.,

Воблачнасць складала ў сярэднім 80% агульнага пакрыцця неба.

29.V.35 г.

Н. Малішэўская.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЗА САКАВІК м-ц 1935 года

Першая дэкада сакавіка характарызавалася марозным надвор'ем. У другой дэкадзе т-ра значна павысілася, па начам яшчэ наглядаліся маразы, а ўдзень паўсюды наглядаліся дадатныя т-ры. Падобнае становішча толькі з яшчэ большымі дняўнымі павышэннямі т-ры працягвалася ў пачатку 3-яй дэкады. У канцы м-ца зноў захаладала.

Сярэдняя месячная т-ра вагалася ад —1,3° да —3,2°. Самая высокая сярэдн. месячная наглядалася ў паўночна-заходняй і паўднёва-заходняй частках БССР. На ўсёй астатняй тэрыторыі наглядаліся больш нізкія т-ры. Максімальная месячная т-ра вагалася ад 6° да 12°, мінімальная—ад —13° да —25°. Прычым самыя значныя маразы наглядаліся на поўначы БССР (Дрыса), а самая нізкая на поўдні (Васілевічы—Рэчыцкага р-на).

Ападкаў выпала або нармальная колькасць, або меншая за нармальную. Месячныя сумы ваגаліся ад 13 да 39 мм.

Меншая колькасць выпала пераважна ў паўднёва-заходняй частцы. Ападкі выпадалі амаль выключна ў апошняй дэкадзе і ў большасці незначнымі колькасцямі—менш 5 мм. у суткі.

Вятры пераважалі заходніх і паўднёвых напрамкаў. Снегавы насціл у большасці раёнаў пачаў сходзіць на працягу гэтага м-ца. Застаўся ён да канца месяца толькі ў раёнах каля ўсходняй мяжы БССР.

25.V.35 г.

Н. Малішэўская.

АГРАМЕТАНАЛІЗ

за II-ю дэкаду мая

Ход тэмпературы гэтай дэкады характэран паступовасцю без асоба рэзкіх ваганняў. Адзначаныя асобнымі метстанцыямі замаразкі—ніякага шкоднага ўплыву не мелі.

Ападкі навальніча-ліўнявога характару былі не зусім спрыяючымі, але пашкоджанняў не нанеслі. Метстанцыяй Асіпавічы адзначан град, які нанёс некаторае пашкоджанне, асабліва садам.

Глеба ўвільготнена дастаткова. Пацяпленне за апошнія дні дэкады пры дастатковым увільгатненні глебы стварыла вельмі спрыяючыя ўмовы для больш інтэнсіўнага развіцця як азімых так і яравых культур.

Фаза развіцця азімага жыта — выхад у трубку, вышыня 19—36 см., ацэнка стану добра і здавальняюча.

Фаза развіцця азімай пшаніцы — кушчэнне і пачатак выхада ў трубку, вышыня—12—22 см., ацэнка стану добра і здавальняюча.

Фаза развіцця яравой пшаніцы — ў паўночнай зоне—усходы; у цэнтральнай і паўднёвай зонах—3-ці ліст. Метстанцыя Калінкавічы адзначае кушчэнне, вышыня—4—11 см., ацэнка стану добра і здавальняюча.

Фаза развіцця аўса — у паўночнай зоне — усходы, у цэнтральнай і паўднёвай зонах—3-ці ліст; метстанцыя Калінкавічы адзначае кушчэнне, вышыня—4—12 см., ацэнка стану пераважна добра і здавальняюча.

Фаза развіцця ячменя — у паўночнай зоне—усходы у цэнтральнай і паўднёвай зонах—3-ці ліст; метстанцыяй Калінкавічы адзначаецца кушчэнне, вышыня—4—9 см., ацэнка стану добра і здавальняюча.

Фаза развіцця ільну — усходы, вышыня—3 см., па звышраннім пасевам вышэй 3 см. (да 6 см.).

З сельска-гаспадарчых работ праводзілася пераважна пасадка бульбы, пасеў гародніх культур, месцамі вытвараўся пасеў грэчкі, узмет пароў і г. д.

Садовыя культуры

Яблыня—фаза развіцця—на поўначы стварэнне бутонаў, на поўдні пачатак цвіцення.

Груша—стварэнне бутонаў на поўначы, пачатак цвіцення на поўдні.

Вішня, сліва і ягадныя—пачатак цвіцення, ацэнка стану здавальняюча і добра.

Са з'яў дрэвеснай раслліннасці за гэту дэкаду можна адзначыць: распуканне лісцяў і ўтварэнне сукведцяў рабіны, з'яўленне лісцяў у ліпы, зеляненне бярозы, зеляненне дуба.

С. Б. Орман

Гідраметэаралагічная характарыстыка ўмоў зімоўкі азімых і становішча іх па выхадзе з пад снега

Перазімоўка азімага жыта і пшаніцы ў першую чаргу залежыць ад становішча пасеваў (ступені развіцця і закалкі) у якім расліны падыходзяць к зіме і ад спалучэння гідраметэаралагічных фактараў у асенне-зімне-вясенні перыяд.

Як адзначалася ў характарыстыцы восені 1934 г. (дэкадны бюлетэнь № 34(178) за першую дэкаду снежня 1934 г.) азімыя пасевы закончылі асеннюю вегетацыю ў фазе кушчэння і да зімоўкі прышлі добра падрыхтаванымі. Што-ж датычыцца комплексу метфактараў у зімовы перыяд, то зіма 1934-35 г. мела наступны характар:

Снежань месяц адзначаўся ўстойліва трымаўшыміся адмоўнымі тэмпературамі без рэзкіх хістанняў. Мінімальныя тэмпературы ў некалькіх выпадках апускаліся да —20°.

Снегавы насціл утварыўся толькі месцамі к канцу трэцяй дэкады.

Пачынаючы з 4 студзеня наступіла рэзкае пахаладанне з сярэдня-сутачнымі тэмпературамі апускаўшыміся да —26°, —28° і мінімумамі дахадзіўшымі да —31° —33° пры снегавым насціле не правышаўшым 10 см. У другую і трэцюю дэкады тэмпература падвышаецца. Сярэдне-дэкадная тэмпература ў першую дэкаду хісталася каля —19°, —21° г. зн. на 13°-14° ніжэй сярэдняй шматгадовай (нормы), у другую дэкаду хісталася каля —8° г. зн. толькі на 1° ніжэй нормы і ў трэцюю каля —2° —3° г. зн. на 5° вышэй нормы. Вышыня снегавога насцілу паступова нарастала, к канцу другой дэкады яна дасягала 10—20 см. і к канцу трэцяй 20—40 см.

У першыя дзве дэкады лютага тэмпература была блізкай да нармальнай. Сярэдняя за першую дэкаду была ад —9° да —6° пры норме —8°, —5°. Сярэдняя за другую дэкаду —5°, —3° пры норме —7°, —5°.

Снегавы насціл на апошні дзень дэкады лютага раўняўся 20—40 см., на апошні дзень другой дэкады 25—45 см.,

Пачынаючы з 20 лютага назіраецца значнае пацяпленне з сярэдне-сутачнымі тэмпературамі хістаўшыміся пераважна каля +1° а ў паасобныя дні ў паўночнай палове БССР яна дасягала +2° і нават +3°. Такое становішча спрыяла таянню і ўшчыльненню снега, а пры наступных пахаладаннях і ўтварэнню лёдавай скарынкі.

У першую дэкаду сакавіка тэмпература паветра да 7-га паступова паніжалася, а пасля ізноў стала падвышацца. Мінімальныя тэмпературы апускаліся да —21°, —23°. У другую дэкаду сакавіка наглядаліся дні з днеўнымі нагрэвамі дахадзіўшымі да +3°, +5°, што стварыла ўмовы для далейшага таяння снегу, у выніку чаго к канцу дэкады на палёх пачалі з'яўляцца— праталіны.

Пералом на вясну адбыўся 21—23 сакавіка.

Снег канчаткова знік на поўдні паміж 20—25 сакавіка, на поўначы паміж 1—5 красавіка, пасля чаго пачалося адтайванне і праграванне глебы.

Масавая вегетацыя азімых пачалася на поўдні БССР у першай дэкадзе, а на поўначы ў другой дэкадзе красавіка.

Аналізуючы метэаралагічныя ўмовы зімоўкі азімага жыта і пшаніцы можна адзначыць, што студзень месяц, які характарызаваўся самымі нізкімі тэмпературамі (—31°, —33°) не прадстаўляў ніякай пагрозы не гледзячы на невялікую таўшчыню снегавога насцілу (да 10 см.). Гэта тлумачыцца тым, што, з аднаго боку, пры ўсякім паніжэнні тэмпературы, мінімальныя т-ры пад снегавым насцілам бываюць заўсёды вышэй чым мінімальныя т-ры паветра і з другога боку азімыя ў гэты момант захавалі добрую закалку.

Другі перыяд, які на першы погляд таксама мог паказацца шкодным гэта 3-я дэкада лютага і першая дэкада сакавіка м-ца

Як ужо адзначана выш эй,на працягу трэцяй дэкады лютага м-ца назіралася значнае пацяпленне да значных адліг, пасля чаго ў першай дэкадзе сакавіка наступіла пахаладанне.

Адлігі сярод зімы наогул з'яўляюцца неспрыяючым з'явішчам і нават шкодным, тым больш калі яны змяняюцца значнымі пахаладаннямі. Але ў гэту зіму такая сітуацыя не магла быць шкоднай таму, што снег таяў вельмі павольна і пры такой таўшчыні снегавога насціла, як 25—40 см. большая частка талай вады затрымалася ў снягу і гэтым адхілялася пагроза значных вымачак. Наступіўшае пахаладанне ў першую дэкаду сакавіка працягвалася недоўга прычым расліны былі яшчэ добра пакрыты снегавым насцілам. Такім чынам гэта пахаладанне для азімага жыта і пшаніцы не магло з'явіцца гібельным і расліны вытрымалі яго добра.

Правідловасць вышэй сказанага пацвярджаецца як вынікамі правадзіўшагася на працягу зімы ажыўлення, гэтак і даследвання стану азімых па выхадзе з пад снега, праведзенага метстанцыямі на 15-ы дзень пасля аднаўлення вегетацыі. Становішча пасеваў азімага жыта пасля аднаўлення вегетацыі, метстанцыямі адзначаецца пераважна як добрае, а азімай пшаніцы большасць станцый адзначае як сярэдняе і вышэй сярэдняга, толькі метст. Слуцк, Турск, Васілевічы і Негарэлае адзначаюць становішча азімай пшаніцы ніжэй сярэдняга.

В. Стэфановіч

Адказны рэдактар — *П. Мамаеў*.

Друк. БелАН. Уп. Галоўлітбела № 2894. Зак. № 715. Тыр. 300 экз. 2/4 арк.



Москва
Софийская Набережная
д. № 38
Гидрометеорологическая Станция
Ц. Б. К.



